### *Крыніцы і літаратура*

1. Павленко, Н. И. История СССР с древнейших времен до 1861 г. / Н. И. Павленко, В. Б. Кобрин, В. А. Федоров. — М.: Просвещение, 1989.
2. Карташов, В. С. История русской церкви. В 4-х т. / В. С. Карташов. — СПб.: Стомма, 2001. — Т. 2.
3. Серков, А. И. История русского масонства / А. И. Серков. — СПб., 1997.
4. Козлова, М. М. История отечественных средств массовой информации / М. М. Козлова. — М.: Мысль, 1988.
5. Васькоў, У. Каталіцтва ва ўсходняй Гомельшчыне / У. Васькоў // ARCHE. — 2007. — № 12 (63).
6. Грыцкевіч, А. Рэлігійная і свецкая адукацыя / А. Грыцкевіч // Наша вера. — 2002. — № 3 (21).


## НАЦЫЯНАЛЬНА-ДЗЯРЖАЎНАЕ ПЫТАННЕ Ў ПРАГРАМНЫХ ДАКУМЕНТАХ БЕЛАРУСКАЙ САЦЫЯЛ-ДЭМАКРАТЫЧНАЙ ПАРТЫІ (БСДП)

***А. Г. Багдановіч***

Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя (БСДП), што ўзнікла летам 1918 г. ў выніку расколу БСГ, на працягу ўсёй сваёй нядоўгай гісторыі паслядоўна выступала за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне беларускага народа, рашуча адмаўляючы гвалтоўныя метады барацьбы. Ключавое месца ў стратэгіі і тактыцы беларускіх эсдэкаў займала нацыянал-дзяржаўнае пытанне. Па сутнасці, гэта была спроба спалучэння класічнага марксізма з традыцыямі беларускага нацыянальна-вызваленчага руху. У сваіх палітычных дэкларацыях, у тым ліку і ў праграме, лідэры БСДП імкнуліся прыстасаваць ідэі сацыялізма да канкрэтна-гістарычных умоў сялянскай Беларусі.

Праца над праграмай БСДП пачалася ў 1918 г. У 1920 г. яна была надрукавана [1, с. 17, 22-24]. Па сведчанні вядомага гісторыка М. Сташкевіча, у падрыхтоўцы праграмы беларускай

сацыял-дэмакратыі прымалі ўдзел А. Смоліч, А. Прушынскі, Б. Тарашкевіч, А. Луцкевіч, Я. Лёсік і інш. Аднак ваенныя падзеі перашкодзілі БСДП правесці ўстаноўчы з'езд і зацвердзіць праграму [5, с. 38].

Перш за ўсё ў сваёй праграме беларускія сацыял-дэмакраты асудзілі капіталістычны лад, пабудаваны на прыбавачнай вартасці, на прыналежнасці сродкаў вытворчасці групе капіталістаў, як лад несправядлівы. Прызнаючы тэорыю класавай барацьбы, БСДП меркавала, што да сацыялізму можна прыйсці шляхам рэформ. Беларускія сацыял-дэмакраты лічылі неабходным спачатку стварыць дэмакратычнае грамадства і толькі пасля гэтага перайсці да будаўніцтва сацыялізму. «І яшчэ дамагаецца партыя працаўнікоў, каб і палітычная ўлада належыла не групе капіталістаў, а ўсяму народу і тым, каго народ выбярэ, і каб у выбарах гэтых і ва ўсім жыцці адно права мелі людзі — ці то багатыя, ці бедныя, дужыя, ці слабыя, адным словам, каб у дзяржаве панаваў парадак дэмакратычны. Толькі ў такіх варунках можа працаўнік абараніць свае правы…».

На думку эсдэкаў, усе сацыяльныя і эканамічныя рэформы можна ажыццявіць толькі ў свабоднай і дэмакратычнай краіне. БСДП прапаноўвала ўвесці свабоду слова, друку, сходаў, партый, арганізацый, саюзаў, сумлення, недатыкальнасць асобы і жылля, тайну перапіскі, роўнасць грамадзян перад законам, аддзяленне царквы ад дзяржавы. Палітычным ідэалам беларускіх сацыял-дэмакратаў была дэмакратычная рэспубліка на чале з парламентам, выбраным на аснове усеагульнага роўнага тайнага выбарчага права з захаваннем правоў нацыянальных меншасцяў шляхам прапарцыянальнага прадстаўніцтва.

Вялікую ўвагу надавалі эсдэкі нацыянальнаму пытанню. Мэтай партыі было зрабіць свой народ раўнапраўным членам інтэрнацыянальнай сям'і. «У царства сацыялізму ўвойдзе беларускі народ, як роўны з іншымі народамі…». Беларускія сацыял-дэмакраты былі ўпэўнены, што развіццё нацыянальнай культуры не толькі не перашкаджае агульнаму ходу гісторыі, а,

наадварот, дапамагае «справе работніцкай, сацыялістычнай». Па іх меркаванню, вольны ад эксплуатацыі народ будзе выяўляць сваю творчасць у нацыянальных формах. Задачай сацыялізма з’яўляецца не сціранне нацыянальных асаблівасцей, а іх культававанне. Прагрэс павінен весці не да асіміляцыі народаў, а да найвышэйшай формы іх згоднага жыцця, да працоўнага інтэрнацыяналу.

БСДП паслядоўна выступала за «найпаўнейшае, найшырэйшае, найдасканальнейшае развіццё беларускай культуры». З гэтай нагоды у праграме партыі былі сфармуляваны наступныя патрабаванні:

1. адзіная працоўная школа ўсіх тыпаў і ступеняў на беларускай мове;
2. спецыяльная ўвага з боку дзяржавы да развіцця беларускай народнай творчасці, шырокага развіцця выдавецтва, навуковых і культурных інстытутаў, пазашкольнай асветы;
3. незалежная Беларуская Дэмакратычная Рэспубліка, якая б ахоплівала ўсе землі, дзе большасць насельніцтва складаюць беларусы;
4. культурна-нацыянальная аўтаномія для нацыянальных меншасцяў у Беларусі.

Заўважым, што пошук шляхоў вырашэння нацыянальнага пытання ў сацыял-дэмакратаў адрозніваўся ад памкненняў іншых беларускіх партый сацыялістычнай арыентацыі. Лідэры БСДП былі ўпэўненны, што толькі спрыяльны знешні фактар дазволіць беларусам рэалізаваць свае «права людзьмі звацца».

Восенню 1918 г. ў сувязі з крушэннем надзей на кайзераўскую Германію сацыял-дэмакратычнае кіраўніцтва БНР асабліва настойліва імкнулася ўстанавіць сувязь і дасягнуць ўзаемаразумення з савецкім кіраўніцтвам Расіі як на афіцыйным узроўні, так і па лініі міжпартыйных кантактаў. Аднак на той момант кіраўніцтва Савецкай Расіі пад уплывам дзеячаў Абласнога выканаўчага камітэта Заходняй вобласці і фронту не

спяшалася вырашаць пытанне аб самавызначэнні беларускай нацыі.

З пачатку польскай акупацыі вясной 1919 г. шэраг беларускіх партый і арганізацый, у тым ліку і БСДП, пайшлі на супрацоўніцтва з палякамі, спадзяючыся з іх дапамогай здзейсніць ідэю беларускай дзяржаўнасці. У гэты час лідэр БСДП, старшыня ўрада БНР А. Луцкевіч прапанаваў вырашыць беларускае пытанне наступным чынам:

1. Польшча павінна прызнаць незалежнасць Беларускай рэспублікі і даць ёй магчымасць пачаць дзяржаўнае будаўніцтва на акупіраванай тэрыторыі заходняй і ўсходняй часткі Беларусі з Мінскам;

2. Рада рэспублікі і польскі ўрад павінны заключыць дагавор аб федэрацыі Беларусі і Польшчы;

3. Беларускі ўрад, арганізаваўшы свае ўзброеныя сілы, мае планы пашырэння тэрыторыі за кошт усходняй часткі Беларусі, таму і прапаноўвае заключыць ваенны саюз для барацьбы з Савецкай уладай, але абапіраючыся на свае ўзброеныя сілы [2, с. 112].

12 снежня 1919 г. на сесіі Рады БНР сацыял-дэмакратычная фракцыя выказалася за прыняцце граматы аб «уніі Беларусі з Польшчай» і падтрымала ідэю Пілсудскага аб правядзенні плебісцыту на акупаванай польскімі войскамі беларускай тэрыторыі. Аднак гэта палітыка была адрынута эсэраўскай большасцю.

Пасля вызвалення Мінска 11 ліпеня 1920 г. ад польскіх інтэрвентаў БСДП выступіла як апазіцыя у адносінах да Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі.

У Заходняй Беларусі БСДП знаходзілася ў апазіцыі да польскага ўрада, прытрымліваючыся легальных форм барацьбы. БСДП разам з БПС-Р і БПС-Ф выступіла з пратэстам з нагоды падпісання 12 кастрычніка 1920 г. у Рызе прэлімінарнага міру паміж РСФСР і Польшчай. «Мы — беларускія сацыялістычныя партыі: сацыялісты-рэвалюцыянеры, сацыялісты-дэмакраты,

сацыялісты-федэралісты, не гледзячы на разбежнасць нашых сацыяльных і палітычных поглядаў, …вымагаем:

1. Перагляду прэлімінарнага міру і ўстанаўлення дзяржаўных расійска-беларускіх і беларуска-польскіх граніц па этнаграфічнаму прынцыпу;

2. Дапушчэння як раўнапраўнага боку на мірныя расійска-польскія перагаворы дэлегацыі Беларускай Народнай Рэспублікі, як адзінага правамоцнага прадстаўніка беларускага народу;

3. Ачышчэння этнаграфічнай беларускай тэрыторыі ад акупантцкіх, як польскіх, так і расійскіх войск;

4. Няўмешання ні Расіі, ні Польшчы ва ўнутраныя беларускія справы» [3, с. 820].

Няўдачы вызваленчай барацьбы ў Заходняй Беларусі, з аднаго боку, і поспехі новай эканамічнай палітыкі (НЭП), таксама абвешчаная ў БССР палітыка беларусізацыі і каранізацыі і т.зв. «узбуйненне» БССР, калі ёй вярнулі часткі Віцебскай, Гомельскай і Смаленскай губерняў, з другога, значна паўплывалі на настроі ў БСДП. Сацыял-дэмакратычныя паслы польскага Сойма П. Валошын, П. Мятла і Б. Тарашкевіч выйшлі з БСДП і перайшлі ў больш левую Беларускую партыю незалежных сацыялістаў, якую ўзначаліў Сымон Рак-Міхайлоўскі. 24 чэрвеня 1925 г. яны стварылі самастойную фракцыю ў Сойме — Беларускую сялянска-работніцкую грамаду (БСРГ). У канцы 1925 г. разам з камуністамі яны пачалі ствараць аднайменную масавую арганізацыю і ўступілі ў КПЗБ. БСДП спыніла сваё існаванне.

Увогуле, у сваіх палітычных дэкларацыях БСДП заяўляла аб сабе як партыя парламенцкага тыпу сацыял-дэмакратычнай арыентацыі. Аднак у поўным сэнсе такой партыяй яна не стала. БСДП не мела разгалінаванай сеткі арганізацый на месцах. У той жа час БСДП стала важным фактарам грамадска-палітычнага жыцця края ў 1918-1925 гг. Яна аб’ядноўвала галоўным чынам прадстаўнікоў беларускай інтэлігенцыі, якая ў той ці іншай ступені была звязана з сялянствам.

Па сваіх палітычных устаноўках і класавай сутнасці БСДП хаця і заяўляла аб сваёй сацыялістычнай арыентацыі, тым не менш па сваёй сутнасці заставалася нацыянальна-дэмакратычнай партыяй, якая імкнулася перш за ўсё рашыць нацыянальна-дзяржаўныя пытанні і толькі потым — задачы сацыяльнай рэвалюцыі. Актыўны дзеяч беларускай сацыял-дэмакратыі Я. Лёсік у рэдакцыйным артыкуле газеты «Беларускі звон» сцвярджаў: «Мы перш за ўсё беларусы, і ўжо потым сацыялісты ці не сацыялісты, дэмакраты ці не дэмакраты, кансерватысты ці не кансерватысты». І далей: «Служыце народу, а не людзям, любіце нацыю…» [4, с. 17].

Беларуская сацыял-дэмакратыя бачыла магчымасць сацыялізму ў адаленнай перспектыве. Для беларускіх сацыял-дэмакратаў было відавочна, што грамадства сацыяльнай справядлівасці можа нарадзіцца толькі ў выніку працяглай стваральнай працы і рэфармавання сацыяльна-эканамічных адносін. Такім чынам, паводле сваіх праграмных установак БСДП набліжалася да класічных заходніх сацыял-дэмакратый. Іншая справа, што сацыяльна-эканамічныя і палітычныя рэаліі тагачаснай Беларусі не спрыялі ажыццяўленню сацыял-дэмакратычных ідэалаў.

### *Літаратура*

1. А.Ж. Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя. Яе мэты і заданні. Папулярны выклад праграмы // Беларусь. — 1989. — № 10.
2. Антон Луцкевич: Материалы следственного дела НКВД БССР. — Мн.: БелНИИДАД, 1997.
3. Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі. Том 1, Кніга 2, Фонд № 582 Дзяржаўнага Архіву Літвы. Беларускі інстытут навукі і мастацтва. Таварыства беларускага пісьменства. Наша Ніва. — Вільня – Нью-Ёрк – Менск – Прага, 1998.
4. Лёсік, Я. Мы перш за ўсё беларусы: проза, публіцыстыка / Язэп Лёсік. — Мн.: Бел.кнігазбор, 2004.

5. Октябрь 1917 и судьбы политической оппозиции. Часть II. У истоков политического противостояния. Материалы и документы по истории общественных движений и политических партий Республики Беларусь — Гомель,1993.

## СИСТЕМА ОБРАЗОВАНИЯ ОРДЕНА ИЕЗУИТОВ В БЕЛАРУСИ

***И. А. Корнеенкова***

Система образования на территории Беларуси начинает формироваться во второй половине XVI века. К этому времени уже сформировался белорусский народ, оформились социальные группы и сословия, определились основные составляющие материальной и духовной культуры. В это же время на территорию Беларуси проникают идеи Реформации и Возрождения, что приводит к сосуществованию православия, католицизма и протестантизма. Представители всех конфессий стремятся создать свои учебные заведения. Но наиболее стройную систему образования удается выстроить ордену иезуитов.

Еще до создания Речи Посполитой в 1569 г. на белорусских землях появляются первые католические школы при местных костелах: в 1522 г. в Гайне Борисовского уезда и около 1545 г. в Медведицах Слуцкого уезда. Однако активное создание католических школ начинается с появлением на белорусских землях иезуитов, которых поддерживало правительство короля Стефана Батория. Основной задачей иезуитов было ополячивание и окатоличивание православного населения, а также борьба с идеями Реформации и протестантизмом.

Иезуиты сразу же включились в миссионерскую деятельность. Основное внимание они сосредоточили на создании средних учебных заведений — коллегиумов. В Вильно коллегиум был открыт в 1570 г., а через восемь лет он был преобразован в академию. Летом 1580 г. по указу Стефана Батория был открыт Полоцкий иезуитский коллегиум, который стал первым средним